База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# АДКРЫЦЦІ НА СЯРЭДНЕВЯКОВЫМ ПАСАДЗЕ

**З**АКОНЧЫЎСЯ палявы сезон археалагічнай экспедыцыі абласнога краязнаўчага музея ў Гомельскім парку культуры і адпачынку імя Луначарскага. За два гады раскопак паблізу сінатэатра імя Ісачанкі зроблены цікавыя навуковыя адкрыцці, якія дазваляюць не толькі дапоўніць, але і пераглядзець уяўленні пра далёкае мінулае Гомеля. І хаця працягваецца вывучэнне шматтысячных калекцый знаходак, рэстаўрацыя ўнікальных прадметаў, навуковае апісанне здабытых матэрыялаў, прыйшоў час падвесці першыя вынікі.

Яшчэ зімой 1985 года, калі коўш экскаватара, які працаваў на будаўнічай пляцоўцы паблізу кінатэатра, пачаў выкідваць з грунтам пазелянелыя ад часу медныя манеты, іржавыя падковы, гарматныя ядры і россыпы гліняных чарапкоў, меркаванне вучоных, што на гэтым месцы размяшчалася частка старажытнага горада, пацвердзілася. Пасля агляду сценак будаўнічага катлавана археолагі выявілі сярэдневяковы культурны пласт — пласт зямлі, які захоўвае сведчанне мінулага.

Раскопкі 1987 года разгарнуліся на дзвюх пляцоўках — справа і злева ад уваходу ў кінатэатр, там, дзе па праекту павінны быць закладзены фундаменты новага будынка. Пачатак работы не прадвяшчаў знаходак: верхнія часткі культурнага пласту аказаліся разбуранымі яшчэ ў мінулым стагоддзі. І ўсё ж ніжэй цагляных кладак цяпліцы часоў князя Паскевіча пачалі трапляцца прадметы XV!—XVIII стагоддзяў. Гісторыя Гомеля гэтага перыяду напоўнена падзеямі барацьбы з перакопскімі татарамі, якія не раз спрабавалі захапіць горад у час грабежніцкіх паходаў на землі пэўднёва-ўсходняй Беларусі. Гомель, які ўваходзіў у састаў Рэчы Паспалітай, быў моцнай крэпасцю на мяжы з Маскоўскай дзяржавай. Пагранічны горад часта падвяргаўся асадам, неаднаразова пераходзіў з рук у рукі, моцна пацярпеў у час казацкіх войнаў.

У час раскопак адкрыты сляды драўляных будынкаў з рэшткамі некалі цудоўных печаў, упрыгожаных кафлямі. Пласціны гліняных кафляў пакрыты мудрагелістым раслінным і геаметрычным арнаментам. А на адным з іх мы ўбачылі адлюстраванне вяльможы ў багатым адзенні. Знойдзены інструменты рамеснікаў, прадметы быту, упрыгажэнні. Вялікая калекцыя шкляной І глінянай пасуды. Сярод цікавых знаходак — гарматны ствол, спецыяльныя шчыпцы для вырабу свінцовых куль, гліняныя стаканчыкі са слядамі металу — прыналежнасць бронзаліцейшчыкаў, металічная накладка для адзення з адлюстраваннем львінай галавы. На адной з сядзіб жыў пісьменны чалавек, магчыма, пісар. Ва ўсялякім выпадку гэтаму гараджаніну даводзілася многа пісаць: у яго доме знойдзена шмат шкляных чарнільніц. Узрост выяўленых пабудоў пацвярджаюць манеты Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Швецыі і Расіі, якія захавалі даты чаканкі і прозвішчы кіраўнікоў.

Адзін з найбольш цьмяных перыядаў у гісторыі Гомеля — XIV — XV стагоддзі. Паводле сведчання пісьмовых дакументаў, з пачатку XIV стагоддзя горад уваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага, аб’яднанай беларуска-літоўскай дзяржавы. У час раскопак удалося адкрыць сляды пабудоў гэтага часу. Уцалелі паглыбленыя ў грунт ніжнія часткі дамоў з рэшткамі печаў. На падлозе адной пабудовы знойдзены сярпы, спражкі, конскія цуглі і баявая сякера. Відавочна, тут жыў радавы гараджанін, што ўдзельнічаў у час ваенных дзеянняў у гарадскім апалчэнні.

З поўнай упэўненасцю можна сказаць, што найвышэйшы росквіт горада адносіцца да іншага, больш ранняга перыяду, — эпохі Старажытнай

Русі. Хаця Гомель упершыню з'яўляецца на старонках летапісаў толькі ў сярэдзіне XII стагоддзя, але па знаходках можна меркаваць пра яго, як пра населены пункт з даўно развітым гандлёва- рамесным пасадам. Каштоўнейшых археалагічных сведчанняў гераічнай эпохі славутага «Слова пра полк Ігараў» і Батыева нашэсця на Русь так многа, што адзін іх пералік зойме дзесяткі старонак навуковай справаздачы.

Што ж уяўляў сабой Гомель у XII—XIII стагоддзях? Летапісы малююць яго як добра ўмацаваны пункт на паўночных рубяжах Чарнігаўскага княства. Ужо ў 1142 годзе горад вытрымаў асаду смаленскіх палкоў, якія прывёў у чарнігаўскія ўладанні ваяўнічы князь Расціслаў Мсціславіч. Узрастанне палітычнага значэння Гомеля выразілася ў з'яўленні ў другой палавіне XII стагоддзя ўласнага ўдзельнага княжацкага стала. Багаты людскімі і матэрыяльнымі рэсурсамі горад-крэпасць прыняў вялікага кіеўскага князя Ізяслава Давыдавіча, які ўцёк ў час усобіцы. Ён сабраў тут вялікае войска і адправіўся на пакарэнне суседніх зямель.

На Гомельскім пасадзе ў XII—XIII стагоддзях пражывала асноўная частка насельніцтва горада, які займаў у той час не менш 35—40 гектараў тэрыторыі высокай сожскай тэрасы. Гомель валодаў двума паясамі драўляна-земляных умацаванняў, якія складаліся з валоў і рвоў. Вонкавы пояс ахопліваў горад ад вытокаў рова, вядомага пад назвай Кіеўскі спуск, і ішоў уздоўж сучаснай вуліцы Працоўнай у бок старажытнага рова Гамяюк. Унутраны, які абараняў ядро горада, апаясваў пляцоўку над ракой Сож, дзе зараз размешчаны будынак абласнога музея і Палаца піянераў і школьнікаў.

Пасад быў забудаваны драўляным жыллём і рамеснымі майстэрнямі. Пад імі часта размяшчаліся склепы-падклеці, у якіх захоўваліся прадукты, пасуда, бытавы і гаспадарчы інвентар. Падобна старажытным Ноўгараду, Кіеву, Полацку, Мінску, Брэсту, вуліцы Гомеля мабыць, былі выма-шчаны дрэвам.

Пра быт гамяльчан расказваюць шматлікія знаходкі: навясныя дзвярныя замкі, ключы, красала для высякання агню, лаясныя спражкі, касцяныя грабяні-расчоскі і вухаверткі. Шырока выкарыстоўвалася ганчарная пасуда, у тым ліку буйныя сасуды для вадкасцей — карчагі. У кожнай пабудове знойдзены бронзавыя ўпрыгажэнні: пярсцёнкі, бранзалеты з мудрагелістым арнаментам, падвескі, скроневыя пярсцёнкі. Яшчэ больш шкляных упрыгажэнняў: пацерак і пярсцёнкаў.

З майстэрань пасаду выходзіла гліняная пасуда, скураныя і касцяныя вырабы. Тут працавалі кавалі і бронзаліцейшчыкі. Знойдзены цэлы набор цяслярных і сталярных інструментаў: долаты, стругі, свердзелы, бураў. У майстэрні, якая загінула пры пажары ў пачатку XIII стагоддзя, займаліся заточкай і паліроўкай бляшаных вырабаў. Тут выяўлены абломак наждачнага круга, шліфавальная плітка, дзесяткі тачыльных брускоў. Прыкметную ролю ў жыцці гараджан адыгрывалі розныя промыслы і хатнія заняткі, сярод якіх асаблівае развіццё атрымалі прадзенне, ткацтва і рыбная лоўля.

Горад вёў ажыўлены гандаль не толькі з навакольнымі паселішчамі, але і з «маці га-радоў рускіх» — Кіевам. Адтуль везлі дарагую шкляную пасуду, мяккі вырабны камень — ружовы оўруцкі сланец. З далёкіх візантыйскіх правінцый праз Кіеў траплялі ў Гомель амфары з паўднёвым віном і аліўкавым алеем. Такія прадукты ўпрыгожвалі сталы прадстаўнікоў гарадской вярхушкі. Гандаль знаходзіўся ў руках багатых купцоў і дробных гандляроў. Аднаму з іх належалі вагі для ўзважвання срэбра, дакладней, бронзавая чаша ад ваг, знойдзеная пры раскопках.

У горадзе знаходзіўся гарнізон з прывілеяваных воінаў — княжацкіх дружыннікаў. Пры раскопках старажытна-рускіх пасяленняў прадметы іх экіпіроўкі сустракаюцца параўнальна рэдка. У Гомелі ўдалося знайсці не толькі дзесяткі наканечнікаў баявых стрэл, камплекты конскіх цугляў, шпоры, але і абрыўкі дарагакаштуючых кальчуг, перакрыжаванні мечаў, бронзавы наканечік ножнаў. Да ліку ўнікальных знаходак адносіцца набор дэталей ахоўнага панцыра: сотні сталёвых пласцінак, жалезныя наручы. Гомельскі воін, якому належаў гэты даспех у другой палавіне XII — пачатку XIII стагоддзяў, быў закаваны ў браню накшталт заходнееўрапейскага рыцара.

Пры даследаванні гомельскага пасада археолагаў, вядома, цікавіла пытанне аб часе ўзникнення горада, аб першых кроках яго гісторыі. Часам зусім сур'ёзна лічыцца, што Гомель быў заснаваны ў 1142 годзе. Старажытна рускі летапіс, аднак, супярэчыць такому меркаванню, паведамляючы на сваіх старонках, што ў 1142 годзе Расціслаў Смаленскі спрабаваў захапіць ужо існуючы горад Гомій. Археалагічныя матэрыялы таксама з усёй відавочнасцю сведчаць, што Гомель значна старэйшы. Археолагамі яшчэ ў мінулым годзе былі знойдзены рэшткі жылля канца X — пачатку XI стагоддзяў, а ў гэтым — некалькі пабудоў XI стагоддзя.

Зусім нечаканым адкрыццём аказаліся сляды ўнікальнага збудавання – абарончага рова далетапіснага часу. Некалі ён аддзяляў ад карэннага плато тэрыторыю буйнога і добра ўмацаванага пасялення плошчай да 5-6 гектараў. Схілы рова былі ўзмоцнены часта ўбітымі вострымі каламі, каб праціўніку не ўдалося раптоўна ўварвацца ў Гомій. Аб тым, што крэпасць не раз вытрымлівала непрыяцельскія асады, сведчаць застраўшыя ў рове наканечнікі стрэл. Крэпасць існавала ўжо ў IX—X стагоддзях. Але і гэтае пасяленне не было старажытнейшым: на даследаваным участку адкрыты рэшткі жылля – паўзямлянкі і кузні. датаваныя VI—VII стагоддзямі, гэта значыць жыццё пачалося тут за 500-600 гадоў да з'яўлення назвы горада ў летапісу. Апошнія раскопкі дазваляюць меркаваць, што летапіснаму гораду папярэднічаў буйны племянны цэнтр VI—VII стагоддзяў, які да X стагоддзя становіцца горадам-крэпасцю. Новыя археалагічныя даследванні, якія можна правесці ў бліжэйшы час, дапамогуць зрабіць гэтае меркаванне навуковым фактам.

На сярэдневяковым псадзе праведзены маштабныя раскопкі, вынікі якіх вельмі каштоўныя для нашай гісторыі. Але адкрыццяў магло і не быць, калі музея прыняць удзел у навуковых вышуканнях, пад-трыманы камсамолам, штабам студэнцкіх атрадаў, кіраўніцтвам гомельскіх ВНУ. З цікавасцю працавалі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і байцы універсітэта і байцы ўніверсітэцкага навукова-вытворнага атрада «Археолаг», які ўзначальвае выкладчык кафедры гісторыі СССР і БССР Васіль Іосіфавіч Сычоў. Важныя знаходкі зроблены студэнтамі будаўнічага факультэта БИЧТу, навученцамі Гомельскага СПТВ-126, работнікамі гандлю, школьнікамі, членамі маладзёжнага клуба «Талака». Не засталося ў баку ад такой карыснай справы і старэйшае пакаленне гамяльчан. З вялікім энтузіязмам дапамагаў археолагам старшы выкладчык кафедры геадэзіі БИТЧу Віктар Рувімавіч Віленскі. Галоўны геадэзіст аб'ядняня «Гомельпрамбуд», зараз пенсіянер Расціслаў Мікалаевіч Музычэнка бескарыслidf дзяліўся з членамі экспедыцыі вялікім вопытам работы з геадэзічныммі прыборамі, неабходнымі на раскопках.

Рычавыя сведкі сівой даўніны, здабытыя з зямлі, павінны заняць дастойнае месца ў археалагічнай экспазіцыі. На жаль, музей не мае памяшкання, неабходнага для пакащу гэтых рэліквій нашай гісторыі. І ўсё ж супрацоўнікі сектара археалогіі спадзяюцца, што такое, памяшканне будзе знойдзена, і гамяльчане змогуць убачыць ўвачавідкі вынікі адкрыццяў на старажытным пасадзе.

**А. МАКУШНІКАЎ,**
**загадчык сектара археалогіі**
**абласнога краязнаўчага**
**музея, кіраўнік**
**археалагічнага атрада.**
**А. ДРАБУШЭЎСКІ,**
**А. КУРЧЫЦКІ,**
**супрацоўнікі сектара**
**Археалогіі.**